**В. С. Забродская**

# СТАНІСЛАЎ МАНЮШКА І МІНСК

Станіслаў Манюшка нарадзіўся 5 мая 1819 г. у фальварку Убель на Ігуменшчыне (недалёка ад Смілавічаў; цяпер Чэрвеньскі раён). Гэты маёнтак набыў дзед вядомага кампазітара (дарэчы таксама Станіслаў) у гетмана Вялікага Княства Літоўскага Міхала Казіміра Агінскага. Маці будучага кампазітара Альжбета Маджарская, якая калісьці вучылася ў вядомага мінскага кампазітара і выканаўцы П. Карафы-Корбута, перадавала сваё майстэрства таленавітаму хлопчыку. Неўзабаве сям'я Манюшкаў пераехала ў Мінск.

Сёння, гуляючы па вуліцы Інтэрнацыянальнай, што ў Верхнім горадзе, на доме нумар 21 заўважаеш дошку, якая паведамляе, што менавіта тут жыў вядомы кампазітар. У 50-я гг. XIX ст. там знаходзілася кніжная нотная крама Аляксандра Валіцкага – шчырага сябра С. Манюшкі, дзякуючы якому пабачыла свет першая біяграфія кампазітара. Некаторы час сям'я жыла ў Музычным завулку Верхняга горада (цяпер тут знаходзіцца Дзяржаўны музей тэатральнай і музычнай культуры). Вечарамі ў гасцінных пакоях Манюшкаў можна было пачуць музыку, а наведваючы Дамініканскі касцёл на вуліцы Дамініканскай, юнак меў магчымасць слухаць непаўторнае гучанне аргана.

Падчас навучання ў Мінскай гарадской мужчынскай гімназіі, будынак якой знаходзіўся на вуліцы Інтэрнацыянальнай, 19 (цяпер у ім размешчаны Мінскі абласны савет прафсаюзаў), Станіслаў Манюшка паралельна займаўся музыкай пад кіраўніцтвам дырыжора і выдатнага педагога Дамініка Стэфановіча, сярод вучняў якога прыгадаем Фларыяна Міладоўскага, піяністку і кампазітара Камілу Марцінкевіч – дачку Вінцэнта Дуніна-Марцінкевіча.

У семнаццацігадовым узросце Станіслаў Манюшка паехаў у Германію ўдасканальваць сваё кампазітарскае і дырыжорскае майстэрства ў Берлінскай пеўчай акадэміі пад кіраўніцтвам таленавітага педагога прафесара Карла Фрыдрыха Рунгенхагена, а падчас канікул ён наведваў Мінск па розных справах.

Нават пераехаўшы ў Вільню, С. Манюшка часта бываў у Мінску (ён праводзіў тут ад 3 да 6 месяцаў): наведваў бацьку і сваякоў, падтрымліваў сяброўскія сувязі з В. Дуніным-Марцінкевічам, Ваньковічамі і інш., спрыяў выданню музычных твораў Ф. Міладоўскага, прымаў удзел у адукацыі мінскай скрыпачкі Б. Крыгер, сам навучаў мінскую піяністку І. Горват, напісаў артыкул пра мінскага фартэпіяннага і арганнага майстра Бяляўскага.

Падчас аднаго з візітаў у Мінск у кастрычніку 1856 г. на ўрачыстай вечарыне В. Дунін-Марцінкевіч асабіста вітаў музыку кампазітара вершамі ад імя створанага імі героя – Навума Прыгаворкі: «А трэці дудар між намі ўзрос, ён нам братка, // Яму Мінская зямелька родненькая матка!.. // Трэці дудар як загудзе песенькі радненькі, // Бяды дай гора забудзеш, станеш

весяленькі! // А так думкі прыўныўны соладка спявае, // Што за сэрца, бы кляшчамі, дзетачкі, хватае». У 1864 г. С. Манюшка апошні раз прыехаў у Мінск з Варшавы, дзе ён працаваў прафесарам Музычнага інстытута.

Менавіта на сцэнах мінскіх тэатраў пабачылі свет вадэвілі, музычныя камедыі і камічныя оперы, створаныя С. Манюшкам. У 1834 г. адбылася прэм'ера вадэвіля «Канторскія служачыя». На лібрэта яшчэ невядомага шырокай публіцы пачынальніка новай беларускай літаратуры В. Дуніна-Марцінкевіча напісаны «Рэкруцкі набор» (разам з К. Кжыжаноўскім). Мінская публіка пабачыла гэтую пастаноўку на сцэне ў верасні 1841 г. з нагоды прыезду ў Мінск новага генерал-губернатара Мірковіча. У першай палове лістапада 1843 г. трупай таленавітага В. Шмідгофа пастаўлены аднаактны жарт «Латарэя» (лібрэта О. Корвін-Мілеўскага). У 1852 г. публіцы прадстаўленыя на сцэне «Спаборніцтва музыкаў» і «Чарадзейная вада» (дарэчы ў Мінску гэты спектакль ставіўся 21 раз). Таксама спадабалася мінскай публіцы опера «Галька», якая прагучала тут у 1854 г. (была пастаўлена ў Вільні ў 1848 г.). Прэм'ера важнай сімвалічнай падзеі для беларускай прафесійнай музыкі, а таксама тэатра – пастаноўка оперы «Ідылія» («Сялянка») адбылася 9 лютага 1852 г. менавіта ў Мінскім гарадскім тэатры.

5 мая 2009 г. прыхільнікамі музыкі шырока адзначалася 190-я гадавіна з дня нараджэння Станіслава Манюшкі. У Дзяржаўным музеі тэатральнай і музычнай культуры ў Мінску яго творы выконвала трыо «Вытокі», у навуковай бібліятэцы імя Якуба Коласа Нацыянальнай акадэміі навук была прадстаўлена экспазіцыя «Музычны свет Станіслава Манюшкі». На ёй былі экспанаваны 58 выданняў яго твораў, зборнік вершаў Уладзіслава Сыракомлі «Бяседы і рытмы», некаторыя з якіх прысвячаліся С. Манюшку, а таксама тэксты такіх музыказнаўцаў, як В. Рудзінскі, С. Невядомскі, З. Яхімецкі. Таксама быў прадстаўлены біяграфічны нарыс Б. Вільчынскага пра С. Манюшку. Былі выстаўленыя і кнігі з аўтографамі сучасных белару-скіх даследчыкаў творчасці кампазітара – А. Мальдзіса, У. Мархеля, В. Скарабагатава, Б. Смольскага. У камернай зале мінскай філармоніі 10 чэрвеня 2009 г. адбылася прэзентацыя кампакт-дыска «Новае неба Станіслава Манюшкі», які запісаў ансамбль «Класік-Авангард» пад кіраўніцтвам Уладзіміра Байдава.

3 верасня 2016 г. у скверы каля ратушы на плошчы Свабоды была ўсталявана скульптурная кампазіцыя, тэма якой «Жыхары Мінска XIX стагоддзя: кампазітар Станіслаў Манюшка і драматург Вінцэнт Дунін-Марцінкевіч – стваральнікі беларускай нацыянальнай класічнай оперы» (аўтары скульптуры – Леў і Сяргей Гумілеўскія).

Сёлета ў межах Рэспубліканскага плана мерапрыемстваў па святкаванні 200-годдзя з дня нараджэння нашага славутага земляка рэалізуюцца шматлікія праекты. Юбілей кампазітара ўключаны ў Спіс памятных дат ЮНЕСКА на 2019 год. Прыгадаем найбольш значныя з падзей, якія адбываюцца ў гэтыя дні ў Мінску.

5 лютага 2019 г. Беларускі саюз мастакоў у сталічным Музеі гісторыі тэатральнай і музычнай культуры правёў пленэр, прысвечаны 200-годдзю з дня нараджэння С. Манюшкі. Падчас творчага вечара «Музыкай святой тут поўніцца душа», які прайшоў 24 красавіка ў галерэі «Лабірынт» Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі адбылася прэзентацыя новага віртуальнага праекта «Станіслаў Манюшка. Музычны рамантык з Міншчыны», рэалізаванага на інтэрнэт-партале бібліятэкі.

Праведзены шматлікія форумы, канферэнцыі, круглыя сталы, прысвечаныя гэтай падзеі. Так, 3 мая ў Музеі гісторыі тэатральнай і музычнай культуры адбыўся круглы стол да 200-годдзя з дня нараджэння кампазітара, а таксама прэзентацыя выставы «Станіслаў Манюшка. Падарожжа ў XIX стагоддзе».

19 мая 2019 г. у Вялікім тэатры Беларусі адбылася ўнікальная падзея – канцэрт «Манюшка на Радзіме». А 12 чэрвеня ў яго камернай зале аматарам музыкі прадстаўлены канцэрт «Жыццё ў песні. Старонкі "Хатняга спеўніка" Станіслава Манюшкі». У канцы мая 2019 г. у Архікафедральным касцёле імя Найсвяцейшай Дзевы Марыі была ўсталявана мэмарыяльная дошка ў яго гонар (скульптар Валярьʼян Янушкевіч). 30 мая 2019 г. Белдзяржтэлерадыёкампанія прэзентавала дакументальны фільм пра С. Манюшку, які ў чэрвені быў паказаны на рэспубліканскім тэлебачанні.

Такія падзеі, звязаныя з жыццём і творчасцю Станіслава Манюшкі, насычаюць жыццё Мінска з моманту нараджэння таленавітага кампазітара да сённяшняга дня.

**С. П. Кубека**

## УДЗЕЛ БЕЛАРУСАЎ І ЎРАДЖЭНЦАЎ МАГІЛЁЎШЧЫНЫ Ў ВАЕННЫХ ДЗЕЯННЯХ НА ФРАНТАХ ВЯЛІКАЙ АЙЧЫННАЙ ВАЙНЫ (1941 – 1945)

Беларускі народ у барацьбу з ворагам уключыўся з першых дзён Вялікай Айчыннай вайны. Усяго на франтах вайны змагалася больш мільёна ста тысяч беларусаў і ўраджэнцаў Беларусі. Сярод прадстаўнікоў 30 нацыянальнасцей, абараняўшых Брэсцкую крэпасць, былі і ўраджэнцы Беларусі: У. Шаблоўскі, А. Махнач, арганізатар абароны Холмскіх варот крэпасці Я. Фамін і інш.

Створаны ў выключна складаных абставінах Цэнтральны фронт узначаліў ураджэнец Магілёўшчыны з в. Балбечына Горацкага павета генерал-палкоўнік Ф. Кузняцоў. У далейшым ён камандаваў вайскамі Паўночна-Заходняга і Цэнтральнага франтоў, удзельнічаў у баях у Прыбалтыцы, і бітве пад Масквой. Воінскія злучэнні, якія прымалі ўдзел у абарончых баях летам 1941 г., узначальвалі беларусы, генералы І. Карпеза, А. Лапацін, І. Камера, Р. Дзівін, П. Корзун і інш.